# *Прытыцкі Сяргей Осіпавіч*

Прытыцкі Сяргей Осіпавіч — першы сакратар Маладзечанскага абкома КП Беларусі — кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Маладзечанскай выбарчай акрузе № 69.

Прытыцкі Сяргей Осіпавіч нарадзіўся ў 1913 годзе ў сям'і селяніна-бедняка вёскі Гаркавічы Гродзенскай вобласці. Член КПСС з 1932 года.

Працоўную дзейнасць тав. Прытыцкі С. О. пачаў з васьмігадовага ўзросту пастухом, потым працаваў батраком, падзёншчыкам і пільшчыкам у кулакоў і памешчыкаў.

У 1931 годзе тав. Прытыцкі С. О. уступіў у Комуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі і быў на кіруючай падпольнай комсамольскай рабоце: сакратаром комсамольскай арганізацыі, сакратаром Крынкаўскага райкома, Гродзенскага і Слонімскага акругкомаў комсамола.

За рэвалюцыйную дзейнасць тав. Прытыцкі С. О. быў прыгавораны польскім судом да пакарання смерцю, якое потым было заменена пажыццёвым зняволеннем. Прасядзеў у турме са студзеня 1936 года да верасня 1939 года — да дня вызвалення Заходняй Беларусі Совецкай Арміяй.

Пасля вызвалення заходніх абласцей Беларусі тав. Прытыцкі С. О. з 1939 да 1941 года працаваў намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкома.



У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны тав. Прытыцкі С. О. знаходзіўся ў распараджэнні ЦК Компартыі Беларусі на Цэнтральным фронце, потым вучыўся на Вышэйшых курсах удасканалення палітсаставу Совецкай Арміі. З 1942 да 1944 года працаваў другім сакратаром ЦК ЛКСМ Беларусі, прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху.

У 1945 годзе тав. Прытыцкі С. О. быў залічан слухачом Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК ВКП(б). У 1948 годзе скончыў партыйную школу і працаваў другім, а потым — першым сакратаром Гродзенскага абкома партыі.

У кастрычніку 1951 года тав. Прытыцкі С. О. быў зацверджан намеснікам загадчыка аддзела партыйных, прафсаюзных і комсамольскіх органаў ЦК КП(б)Б. У 1953 годзе ён быў выбран першым сакратаром Баранавіцкага абкома партыі, а ў студзені 1954 года — першым сакратаром Маладзечанскага абкома КПБ.

За заслугі перад Радзімай тав. Прытыцкі С. О. узнагароджан ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга і медалем «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

Тав. Прытыцкі С. О. — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР трэцяга склікання, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, член Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ